“Быў бы рады вучыцца ў такой школе...”

Гімназіі № 1 Віцебска прысвоена імя Жарэса Іванавіча Алфёрава.

Калектыў установы адукацыі звязвалі са славутым вучоным шчырае сяброўства і плённае супрацоўніцтва. Пачынаючы з 2001 года 27 гімназістаў сталі пераможцамі Міжнароднай навуковай канферэнцыі школьнікаў “Сахараўскія чытанні”, аргкамітэт якой узначальваў Жарэс Іванавіч. Трое навучэнцаў з’яўляюцца стыпендыятамі Фонду падтрымкі адукацыі і навукі (Алфёраўскі фонд). У маі 2007 года па асабістым запрашэнні вучонага група гімназістаў і педагогаў наведала Санкт-Пецярбургскі нацыянальны даследчы акадэмічны ўніверсітэт Расійскай акадэміі навук. Неўзабаве Жарэс Алфёраў завітаў у віцебскую гімназію. Пасля знаёмства з установай адукацыі нобелеўскі лаўрэат пакінуў запіс у кнізе водгукаў: “Я быў бы рады вучыцца ў такой школе і ў такіх настаўнікаў”.

— Прысваенне імя Жарэса Алфёрава — гэта вялікі гонар для нас, але і велізарная адказнасць, — падкрэсліла дырэктар гімназіі № 1 Валянціна Шырокава. — Спадзяюся, нашы выпускнікі ў далейшым жыцці і прафесійнай дзейнасці будуць імкнуцца змяніць свет да лепшага, зрабіць нашу Беларусь яшчэ больш моцнай і квітнеючай краінай, як марыў Жарэс Іванавіч.